Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЯЛЯНСКАЯ ПРАЎДА

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Цана асобнага нумару 20 грош.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (**Wileńska** 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 грош., за радок пэтыту ў 1 шп.

№ 17. Вільня, Пятніца, 7-га лістапада 1924 г. Год I.

Творчае змаганьне.

Ня гледзячы на ўсю нікчэмнасьць тых уступак, якія нашы паслы ў Сойме вырвалі ў польскага ўраду ў пастаці „языковых законаў“, народ наш ждаў, што з 1 кастрычніка гэтага году справа беларускае школы скранецца з мёртвага пункту.

Пустыя лятуценьні! „Языковыя“ законы так мусіць і названы затым, што яны істнуюць „на языку“, але не на дзеле....

Мы ўжо пазнаёміпі нашых чытачоў з знамянітым „віленскім экспозэ“ міністра асьветы Міклашэвскага, які заявіў, што 1924—25 школьны год не пабачыць ніводнае ўрадавае беларускае школы, бо гэта мае быць толькі „падгатаваўчы“ год.

Калі нават і так, дык мо‘ хто падумае, што ўрад падгатаўляе прынамся да наступнага году кадры вучыцялёў для беларускіх школ, што арганізуе нейкія курсы, ці вучыцельскую сэмінарыю для іх?

Ды нічога падобнага! Урад ня толькі сам не „падгатаўляе“ вучыцялёў для беларускіх школ, але дагэтуль не дае дазволу на адкрыцьце гэткіх курсаў Цантральнай Беларускай Школьнай Радзе, і ў будучым 1925—26 школьным годзе ізноў ня будзе ўрадавае беларускае школы, бо... няма „выкваліфікаваных“ вучыцялёў!

Лоўкая „работа“,—праўда?

Ды гэта ня ўсё. З парлямэнцкіх кругоў нас паведамляюць, што, па загаду міністэрства асьветы, паны куратары школьных акругоў разаслалі школьным інспэктарам цыркуляр, у якім гаворыцца, каб у сёлетнім школьным годзе не адчынялі *ніякіх новых школ, а істнуючыя, калі ў іх мала вучняў, ліквідавалі*—дзеля „ашчаднасьці“....

Цыркуляр гэты меціме вялікую вагу, асабліва ў Заходняй Беларусі, у адносінах да прадбачанага ў „языковых“ законах перарабляньня істнуючых у нас польскіх урадавых школ на беларускія ці хаця-бы двуязычныя—польска-беларускія. Бо-ж, калі польскія школы ў нас пустуюць, і народ згаджаецца пасылаць у іх дзяцей толькі тады, калі ў іх завядуць навуку пабеларуску,—дык школьныя інспэктары, як паслухмяныя ўрадоўцы, хутчэй гэныя школы пазачыняюць зусім (зашто ім пан міністар асьветы, ведама, толькі падзякуе!), чым пераробяць іх на двуязычныя ці на беларускія. Да таго-ж, як відаць з цэлага раду друкаваных у нас карэспандэнцыяў, паліцыя тэрорызуе сялян і гмінную ўладу, нават, за ўкладаньне прыгавораў аб беларускіх школах, пагражаючы карамі за самае *жаданьне* таго, што дазволена законам...

I народ усё больш пачынае лічыць *толькі на свае сілы.* Беларускае насяленьне адчыняе свае прыватныя беларускія школы, на свой кошт утрымлівае вучыцялёў, выпісывае кніжкі для навукі—ведама, беларускія.

Але разам з тым у беларускай масе ўзмацоўваецца перакананьне, што Польская дзяржава, якая бярэ ў беларусаў і маемасьць іх і жыцьцё (рэкрутаў) на роўных правох з польскім насяленьнем, забывае аб гэтай „роўнасьці“ ў той мамэнт, як трэба нашаму народу даць тое, што яму забясьпечана і польскімі-ж законамі, і міжнародавымі міравымі трактатамі....

I гэта адносіцца ня толькі да школьнае справы. Польская ўлада, стануўшы на грунце зьліцьця беларускае тэрыторыі з этнаграфічна польскімі землямі, праводзіць палітыку крайняга цэнтралізму, які робіць жыцьцё Заходняе Беларусі прост *несьцярпімым.* Сцьвярджаюць гэта ня толькі беларусы, ня толькі тутэйшыя палякі—„краёўцы“: аб гэтым сьведчаць прадстаўнікі самае-ж польскае ўлады! Нават нова-назначаны наваградзкі генарал-ваявода Янушайтіс заявіў супрацоўніку „Kur. Wil.“, што аднэй з галоўных прычын, якія вытвараюць на „Крэсах“ . сучаснае „фатальнае“ і „трывожнае“ палажэньне, зьяўляецца „нячуваная супярэчнасьць з жыцьцём“ польскіх законаў, асабліва-ж інструкцыяў да іх, якія „*абсалютна ня лічацца з тамтэйшымі патрэбамі і жыцьцёвымі варункамі*“. А ці-ж не найвялікшай анормаліяй, ці не найбольш ненармальным зьявішчам у Заходняй Беларусі трэба лічыць *польскую школу для беларускіх дзяцей*?!

Беларусы павінны змагацца з гэтымі ненармальнасьцямі ня толькі дарогай пратэстаў і крытыкі з соймавае трыбуны. Нашае змаганьне павінна быць перш за‘ усё *творчым*: тое, чаго, ня гледзячы на нашае правы, польская дзяржава нам не дае, мы павінны самі тварыць для сябе.

На гэту дарогу наш народ ужо і ўвайшоў.

Як даюць беларусам родную школу.

У Палескім ваяводзтве ад пачатку істнаваньня польскае ўлады аж да апошняга часу нельга было й думаць аб адчыненьні беларускае школы. Пан Куратар Вольбэк усімі магчымымі способамі стараўся перш-на-перш задушыць тое, што нейк вырывалася з-пад яго вока,як гэта было з Нясьвіжскаю гімназіяй; а там, дзе толькі пачыналі думаць аб адчыненьні беларускае школы,— там чыста паліцэйскімі способамі „ліквідаваў“ гэта. У прыпадках, калі ўжо ніяк нельга было, захоўваючы хоць прымітыўную прызваітасьць, адмовіць у адчыненьні школы, дык найлягчэйшым выхадам было зрабіць кандыдатаў на вучыцялеў, або кіраўніка „ворагам паньствовасьці польскай“. Апошні мэтад і быў пушчаны ў ход цяпер, калі не ўдалося інакш перашкодзіць адчыненьню беларускае гімназіі ў Клецку.

Не „варожы“ дагэтуль да Польшчы концэсіянэр Шнаркевіч неўспадзеўкі зрабіўся „варожым“ і на падставе гэтага канцэсіі даць нельга... У адносінах-жа да кіраўніка гэтае гімназіі, п. Бараноўскага, якога, відаць, нельга было зробіць „неблаганадзежным“, надта скрыта падвялі другую „міну“—запрапанавалі яму ўрадавую пасаду,—бязумоўна, на нейкі час, бо каб толькі гэткім шляхам у гэты мамэнт зьліквідаваць беларускую гімназію!

„Апеку“ такую п. Вольбэка мы, беларусы, адчувалі надта добра, але думалі, што ад 1 кастрычніка ўсё-ж павінна быць нейкая палёгка.

Яшчэ ўлетку пачалі сяляне прыгатаўляцца да свае роднае школы на ўсім Палесьсі, а найбольш чакаў гэтага Пружанскі павет.

Пачалі зьбірацца сяляне на сходы ды гутарыць, як цяпер пабудаваць сваю школу. Інструкцыя Школьнае Рады надта памагла вёсцы, бо ня трэба было шукаць пісароў, каб улажылі заяву.

Першай вёскай, якая пастанавіла прасіць у Пружанскага Школьнага Інспэктара свае роднае беларускае школы, была в. Шэні, тэй жа гміны. Прыгавор гэтае вёскі запісалі нават у кнігу гмінных прыгавораў ды думалі, што ўсё ўжо будзе добра. Але адміністрацыя Пружанскага павету ў асобах п. старасты Чоэля і школьнага інспэктара п. Аляхоўскага зрабіла такі гармідар, што стэрарызавала ўвесь павет:

Перш-на-перш быў **звольнены войт** Шэнёўскае гміны, нейкі Станкевіч, а на яго мейсца назначаны вядомы злодзей Шышка (быў асуджаны на 3 м. турмы). **Каманданта паліцыі**, у прысутнасьці якога Шэнёўская гміна зрабіла такі прыгавор, **перавялі стуль, а сэкрэтару грозяць рэдукцыяй.** Ад гэтага й пачалося па ўсім павеце.

Староста супольна з інспэктарам Аляхоўскім разьяжджаюць па гмінах ды **грозяць войтам, што за пасьведчаньне прыгавораў на беларускія школы іх чакае цяжкая кара.**

Да 25 кастрычніка прыгаворы на адчыненьне беларускае школы напісалі наступныя вёскі: Шэні, Староволя, Дабучын, Арабнікі, Кацёлкі, Ліпава, Аранчыцы, Бакуны, Руднікі, Якавічы, Чахец і інш.

Школьны інспэктар і ягоная канцэлярыя заяваў ня прыймаюць, а ўпрадстаўніка в. Бакунаў, пагразіўшы турмою, інспэктар вырваў з рук заяву аб адчыненьні бел. школы ды кінуў пад ногі. Цяпер сяляне пасылаюць свае прыгаворы школьнаму інспэктару праз пошту, сьведчучы іх солтысам.

У Староволі п. Аляхоўскі, прыехаўшы з паліцыяй, шукаў усё ініцыятараў. Зроблена было некалькі вобыскаў, але нават інструкцыі Школьнай Рады, як адчыняць школы, не знайшлі. Запужаўшы турмою ды штрафамі, загадалі вучыцелю паляку бываць на ўсіх сходах і неадкладна паведамляць уладу, калі ўзьнімецца справа аб беларускай школе.

Так праводзяцца на Палесьсі, а, асабліва, у Пружаншчыне, „языковыя“ ўставы! Мо‘б нашыя паслы зацікавіліся гэтымі справамі, ды далі раду, што рабіць.

Пружанец.

Бяспрыкладнае надужыцьце.

(„*Przyczynek*“ *да высылкі прав. архіяп. Уладзімера*).

Адзін з нашых парлямэнтарыяў расказаў нам вельмі цікавую рэч, якой сьпяшаемся падзяліцца з нашымі чытачамі. Пэўна-ж, многія з іх былі вельмі зьдзіўлены тэй ветлівай хуткасьцяй, з якой чэхаславацкае пасольства ў Варшаве пайшло на спатканьне польскаму ўраду — ў справе прымусовай высылкі з Польшчы ў Чэхаславакію архіяпіскапа Уладзімера.

Дык вось-жа расказ гэты **зусім здымае гэтую пляму з чэхаславацкай місіі ў Варшаве.**

Да заступніка чэскага пасла ў Варшаве зьявіўся **ўрадовец міністэрства заграні‹ных спраў** і заявіў, што аднаму **польскаму грамадзяніну, Уладзімеру Ціханіцкаму** (— гэта сьвецкае прозьвішча архіяпіскапа Уладзімера), канешна і пільна трэба **на кароткі час** паехаць у Прагу. **Ад імя міністра Скшыньскага** ўрадовец прасіў заступніка чэскага пасла ўраз-жа паставіць візу на пашпарце гэнага грамадзяніна.

Прадстаўнік Чэхаславакіі ахвотна споўніў гэту просьбу, нават і не падумаўшы, што гэным „польскім грамадзянінам“ Уладзімерам Ціханіцкім зьяўляецца „крамольны“ ўладыка Уладзімер, **гвалтам** выкінуты з Польшчы.

Вось якую цікавую „гісторыю аб спрытным польскім урадоўцу і даверчывым чэшскім пасьле расказвае наш карэспандэнт.

Гэтая гісторыя ўносіць **новую** і вельмі арыгінальную дэталь у стаўшую ўжо шэрым шаблёнам працэдуру выкіданьня заграніцу праваслаўных япіскапаў з Польшчы.

Дагэтуль у гэтай „дзяржаўнай **экспэдыцыі**“, у гэтым „паляваньні“ на праваслаўных архіерэяў прыймалі ўчасьце толькі „дэлегаты“:

1) міністэрства „рэлігіяў і асьветы“, 2) „аўта**кефальнага**“ (гэта значыць „пагрэцку“—ў Варшаве **ня маючага ўласнай галавы,**—уласнае волі і розуму, але падлягаючага „галаве“ пана Пекарскага), Варшаўска-Праваслаўнага „Сыноду“ і — 3) міністэрства ўнутраных спраў.

Апошняе і давала гэтаму „Сыноду“ гэтак званую „bracc pium seculare“, ці папростаму — „паліцейскую руку“, каб ухапіць „зьвярыну“.

Дык вось цяпер — да гэтай добра дабранай і „трэнавай“ „яхт-кумпаніі“ **новы польскі міністар загранічных спраў** p. Skrzyński **дадаў яшчэ „дэлегата“ і ад свайго „рэсорту“.**

З нашага простага погляду дзіўнога ў-ва ўсім гэтым няма нічога.

Ці ж трудна спрытнаму ўрадоўцу, пры добрым жаданьні, абаламуціць лішне даверчывага чалавека, ды яшчэ й маючага, exofficio, **дыпляматычны абавязак мець асаблівае і бязумоўнае даверые**

да дэлегата п. міністра загранічных спраў,—міністра, які датаго толькі-што здабыў сабе поўнае даверые ўсяго прадстаўленага ў Лізе Народаў дзяржаўнага сьвету...

Як мы ведаем, новы польскі міністар вельмі **добра і спрытна распачаў** у Жэнэве сваю дыпляматычную працу, заверыўшы „паслоў“ усіх дзяржаваў Лігі ў тым, што „нацыянальныя меншасьці **ўжо маюць** у Польшчы—праз законы 31 жніўня— больш, чым нават вымагаюць таго ўсе трактаты і канстытуцыя Польшчы, узятыя разам“...

Дык вось, пасьля гэткага **шчасьлівага пачатку**, можна, праўду кажучы, нічому ўжо ня дзівіцца...—Дый нас цікавіць у-ва ўсім гэтым нешта іншае.

Ведама нам усім вельмі добра, што так званыя „обцокраёўцы“ **падараваны** Польшчы Вэрсальскімі дабрадзеямі—разам з „далучанамі“ да Польшчы абшарамі, з жывым і мёртвым інвэнтаром, як нейкі „бясплатны дадатак“... Дык ясна, што гэтымі „обцокраёўцамі“ кожын прадстаўнік выканаўчай улады Польскай Рэспублікі — ад п. міністра да п. пастарункова́га можа распараджацца, як захоча.—Дык ня дзіва, што Польшча, у кожным паасобным выпадку, мае права папросту **адмовіцца ад гэтага „падарунку“** і выслаць таго ці іншага „обцокраёўца“ ад сябе вон... Аб гэтым няма што спрачацца...

Але ж тут — нешта іншае. — У пашпарце, выданым „p. Włodzimierzowi Cichonickiemu“, было сказана, што ён — „obywatel Rzeczypospolitej Polskiej“. А калі так, калі праваслаўны архіяпіскап, даўно меўшы ўсе бясспрэчныя правы на „обывательства“, **нарэшце атрымаў „сьцьверджаньне“** іх, хаця-б нават і ў апошні мамэнт — перад самай высылкай заграніцу, — дык ясна кожнаму, што, стаўшыся раптам „obywatelem Polski“, праваслаўны архіяпіскап Уладзімер Ціханіцкі **павінен быў заразжа быць вернены назад у свой край—у Польшчу...**— Бо-ж грамадзянін Польшчы ня можа,—„няма на гэта права“!—быць высланы з краю простым загадам выканаўчае ўлады!

Дык вось-жа мы і радзімо нашым паслом у Сойме „запытацца“ ў п. прэм‘ера—не аб тым, чаму быў высланы „обцокраёвец“ архіяпіскап Уладзімер, але аб тым, **чаму ня быў вернены назад, атрымаўшы „обыватэльства“**, obywatel Rzeczypospolitej Polskiej Włodzimierz Cichonicki...

На „лунінецкім“ працэсе.

Запраўды, часамі і—міністры кажуць праўду!..

Мы добра памятаем, як міністар ун. спраў п. Гюбнэр перасьцерагаў нас усіх у гутарцы з супрацоўнікам „Kur. Polsk.“, **каб ня верылі даняlarсеньням паліцыі** аб тым, быццам яна злавіла лунінецкіх ці якіх іншых „бандытаў“... Мы ведаем і той паданы ў нас артыкул „Robotnika“, у якім была раскрыта „тайна трагэдыі крэсавага насяленьня“—а, паміж іншым, і той няхітры сакрэт, ці спосаб, як „бандыты“ неяк — „дзеля Варшавы — аказываюцца „спайманымі“ і „апазнанымі“ і г. д...

„Пасьля — кароткая сьледзтва, даразны суд і—канцы ў ваду“...

Бязсумліўна, гэтак бывала, напэўна, й ня раз...

Але вось на галосным працэсе лунінецкіх „бандытаў“ аказалася ня ўсё так, як павінна быць, паводле паданага ў „Rob.“ „мэтаду“.

Паліцэйска-пракурорскі „сакрэт“ выкрыўся на судзе ў Пінску. Выкрыўся з такім скандалам, які павінен ужо ўсім аканчальна расчыніць вочы на тое, што робіцца на „Крэсах“, у зьвязку з „бандытызмам“...

Як пахвалялася паліцыя ў сваіх рапартах аб пагоні за „бандытамі“, штось каля 60 сяброў лунінецкай „банды“ было злоўлена адважнымі і спраўнымі паліцэйскімі агентамі. З гэтае капы людзей, што, здаецца, сядзяць і па сёньняшні дзень у вастрогах сьпярша 16, пасьля 11, а ўрэшце толькі пяцера „бандытаў“—ужо зусім „апазнаных“, як забойцы некалькіх асоб, аграбіўшых цягнік і г. далей,—былі аддадзены пад даразны суд.

Мы чулі і чыталі ў часе гэтага працэсу, што пісалася пра судовае сьледзтва. — Усё йшло, як па маслу. — Вось адрывак з газэтных рэляцыяў, падаваных у Пінску — з „wiarodajnych“ кругоў: „Асабліва цяжкія для абвінянага Курыловіча паказаньні далі паліцыянты Рындак і Кутшэба“...

Мы чакалі ўсяго таго, што прарочыў „Robotnik“: „Даразны суд і—канцы ў ваду“...

Аж заместа гэтага — сэнсацыя і рад нячуваных скандалаў!

З пяцёх „найцяжэй“ абвінавачаных „бандытаў“ два (Курыловіч і Фоц) судом апраўданы! Трох другіх (—Нарывончык, Клюк і Ляшчук) — перададзены звычайнаму суду...

Але на гэтым не канец.

Выкрылася, што сьледзтва, якое па закону ня можа „у трыбе даразным“ — цягнуцца больш 2 тыдняў (бо ў „даразным парадку“ разьбіраюцца зусім ясныя і бясспрэчныя справы), тут цягнулася трохі больш... Але „каб фармальна не нарушаць закона“, у пратаколах сьледзтва былі зроблены „падпраўкі“.

Выкрылася і нешта яшчэ цікаўнейшае.—Судзілі „бандыта“, паміж іншым, і **за забойства**. У абвініцельным акце многа гаварылася аб забойстве нейкага Старобінскага. Пракурор падтрымліваў абвіненьне... І вось, раптам адзін з абаронцаў зварачаецца да суда з просьбай дапусьціць, як сьведку.... гэтага самага „забітага“ Старобінскага, які тут-жа сядзіць у суседнім пакоі...

Суд—да пракурора аб яго заключэньне... Пракурор на столькі страціў „фантазію“, што паміж іншым, сьцьвярдзіў, што **яму было ведама**, што Старобінскі жыве... Гэта і было абаронай упісана ў пратакол...

Дзіўная рэч: у польскіх газэтах аб усіх гэтых запраўдных сэнсацыях у стылю Канан-Дойля зусім неяк ня пішуць...

З Сойму.

Далейшая дыскусія.

П. Панятоўкі (Wyzwolenie) слушна даводзіў, што ўсе абаронцы прэм. Грабскага, выхваляючы яго валютную рэформу, карысьцяй ад гэтае рэформы закрываюць усё тое благое, што пагражае краю ў іншых галінах жыцьця насяленьня. Грошы—моцныя і сталыя, але народ, працоўныя масы—зруйнаваны, дзеля таго і прамысловасьць, ня маючы ўнутранага спажыўца, гібеець. Урад, цісьнучы падаткамі насяленьне, **шкадуе толькі абшарнікаў**, робячы ім адным палёгкі, у запраўднасьці здымаючы з іх падатковую павіннасьць. Адначасна ўрад не дае ходу тэй зямельнай рэформе, якая ўжо, быццам, вырашана законадаўчымі ўстановамі Польшчы.

Што датычыць адміністрацыі, дык, ня гледзячы на пацяшаньне прэм‘ера, трэба прызнаць, што стан і склад яе на „Крэсах“ такі, што ўжо ўсе прызнаюць пагрозу **ўтраты гэтых тэрыторыяў** — і ня ў нейкай далёкай будучыні, але ў **беспасярэдня бліжэйшыя часы...** крэсы трактуюцца, як **чысты пасыў У бюджэце**, як толькі **цяжар для скарбу**, як край, напалову ўжо страчаны, у які, дзеля гэтага, папросту ня варта ўкладаць дзяржаўных капіталаў на карысьць і паправу быту яго насяленьня. Цяпер урад аддаў гаспадараваньне на гэтай тэрыторыі ў рукі войска!.. Дык ведама ж, што вайсковае панаваньне заўсёды было і ёсьць радам гвалтаў, самаволі і бяспраўя!.. З усяго ўраду найвялікшую адказнасьць за гэта нясе той, хто запраўды можа быць названы „надміністрам“ (ген. Сікорскі!), у руках якога міністар унутр. спраў, а можа і іншыя,— простыя прылады.

Самаўрад наш—адна мана. Усё і ўсюды — паліцыя! Паліцыя б‘е катуе,—гэта ўжо яе сталы мэтад у Польшчы, а перад усім на „Крэсах“. Выхад з палажэньня—толькі ў запраўдным самаўрадзе мяйсцовага насяленьня, у пэўнай **аўтаноміі**

Суд у Польшчы траціць веру насяленьня. Міністар асьветы—ўжо слаўны ў Польшчы, як „усьмірыцель высілкаў Польшчы ў галіне асьветы“. Яму не павінна быць месца ў урадзе.

Далей аратар дзівіцца, як гэта прэм‘ер і ўвесь габінэт церпіць тую ролю, якую адыгрывае мін. вайны, Сікорскі, які, будучы фактычна ў краі і міністрам унутраных спраў, у Парыжу працуе і робіць дэкларацыі, як міністар загр. спраў, а разам узяўшы, выразна працуе як заграніцай таксама і ў Сойме, на тое, каб скінуць Грабскага і самаму стацца прэм‘ерам.

Канчаючы прамову, аратар „Wyzwolenia“ дамагаецца роспуску гэтага Сойму і новых выбараў, а пакуль што адстаўкі нягодных міністраў.

Пас. Міхальскі (нацыяналіст) дае надзвычайна цікавую крытыку фінансава-эканамічнай палітыкі ўраду (ён жа—былы міністар). Аратар вельмі пэсымістычна глядзіць на фінансава-эканамічны стан Польшчы. Адзіная „пазіцыя“ ў бюджэце, якая апраўдае, нават далёка перавысіць, спадзяваньні „прэлімінару“, гэта стацьця караў і штрафаў за прасрочку падатковых аплат. Што датычыць надзвычайных даходаў, дык тое, што ўзята ў 1924 г., ужо ня можа быць узята у 1925 г. **Усяго недабору будзе не прадугледжана бюджэтам**, фактычна, будзе **ня менш 27 міл. злотых.**

Прамоўца тлумачыць, чаму мы маем добрыя дзеля загранічнага рынку грошы, а ўнутры краю — цяжкі крызіс.

Скандал у Сойме.

Пас. Рабскі (правы) напісаў проці „вызваленцаў“ абражаючую стацьцю. За гэта „вызваленец“ пас. Медзіньскі напаў на „калегу“ Рабскага ў памяшчэньні Сойму. Узьнялася бойка. Прысутныя другія паслы разьнялі біўшыхся. Паслы частавалі сябе ўзаемна такімі „камплімэнтамі“, як „szubrawcy“ і „kanalje“.

У ўкраінскім клюбе.

З агульна-украінскага пасольскага клюбу выступіў былы старшыня яго, дэпутат Антон Васыньчук, не згаджаючыся з тактыкай клюбу ў Сойме.

У клюбе жыдоўскіх паслоў.

5 лістапада была назначана нарада паслоў Жыдоўскага Кола ў справе выражэньня недаверыя ўраду п. Грабскага. Паводле польскіх газэт, поўнай аднадушнасьці сярод жыдоў няма.

Сэнат.

Экспозэ прэм‘ера.

У сваім экспозэ ў Сэнаце прэм. Грабскі перад усім стараўся адкінуць найцяжэйшыя закіды першых прамоўцаў у Сойме—Гломбіньскага і Жулаўскага.

Закід нерэальнасьці бюджэту прэм. назваў непаважным і несправядлівым. Прэм‘ер верыць, што падаткі будуць спагнаны ў сваім часе поўнасьцю. Вельмі цікавым было ў гэтым адказе прэм. на эндэцкую крытыку заяўленьне аб **няўдзячнасьці**, якім прасякнута ўся прамова прэм‘ера. Прэм‘ер прызнаўся, што „здаваляў дамаганьні“ няўдзячных эндэкаў. Дык няварта гэтага рабіць, бо „што зробіш сёньня, заўтра забываецца“. Дзеля гэтага „няўдзячнае заданьне быць на чале непарляманцкага ўраду“.

Пасьля гэтай заявы больш зразумелай робіцца ўся тая абраза, якую адчуў прэм‘ Грабскі ў крытыцы эндэкаў, а таксама і тое мейсца ў „дэклярацыі“, у якім прэм‘ер скардзіўся, што „партыі абсядаюць урад, **прымушаючы яго да ўступак на ўсе бакі, а аднача*сна абцяжаючы яго найцяжэйшымі закідамі*“.

Вось — калі-б, „вымусіўшы ўступкі“, пачулі-б удзячнасьць і адпаведна „падтрымлівалі“, тады—іншая рэч... А так — што ні рабі для іх, гэтым акулам усё мала,—ды яшчэ й лаюцца.

Пасьля гэтай палемікі з „няўдзячнымі“ прэм. у 2 х пунктах гэтак фармулюе праграму свайго ўраду.

1. Утрымаць усімі мерамі валюту—проці напору эканамічнага крызісу;

2. Стварыць такую атмасфэру даверыя да Польшчы заграніцай, якая-б уратавала-бы Польшчу ад узьнімаючаеся ў апошнія часы для яе небясьпекі.

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Водгукі нападу пад Баранавічамі.

Зараз-жа пасьля нападу быў пасланы ў пагоню за партызанамі спэцыяльны цягнік з паліцыяй. У пагоні прыняло ўчасьце і войска. Пагоняй кіруе палкоўнік Гежковскі.

Хаця нападаўшых было толькі 30 з лішкам душ, аблава арыштавала ажно 52 асобы, якіх падазраваюць у ўчасьці ў нападзе.

Як-быццам трохі за шмат...

Рух на Валыні

„Wiek Nowy“ піша, што на Валыні, у адным толькі Бродзкім павеце, адбываюцца напады ажно чатырох ватаг: адна—пад камандай **былога паліцыянта** Думаньскага, другая—Шпака, трэцяя — Войціка і чацьвертая—Возьніка.

У-ва ўсім павеце паліцыя пастаўлена на ногі і ўзмоцнена. 22 полк уланаў пастаўлены ў „баявую гатоўнасьць“.

Барацьба з асаднікамі.

У ваколіцы Багданаўка, на Валыні, узьняўся пажар у гаспадарцы польскага асадніка. Другія асаднікі-палякі пайшлі яго ратаваць. Проці іх выступілі ўкраінскія сяляне, якія не давалі тушыць агню. Сяляне мелі аружжа, але асаднікам удалося адбіць іх. Ідзе сьледзтва. („Gaz. Warsz.“).

Новыя скорпіоны для „Крэсаў“.

А. W. наказуе, што ў сувязі з нападам на цягнік пад Баранавічамі адбудзецца нарада між прэм‘ерам Грабскім і міністрам унутраных спраў Гюбнэрам аб новых спосабах забясьпечаньня супакою на „Крэсах“, пасьля чаго будзе склікана паседжаньне палітычнага камітэту рады міністраў.

Паміж іншым, на апошняй нарадзе мае быць вырашана пытаньне **аб увядзеньні ў чатырох „крэсавых“ ваяводзтвах вынятковага стану.**

У гэтым духу паслы-эндэкі падалі ў Сойме сьпешную прапазіцыю, дамагаючыся новых „рашучых“ мер для і без таго стэрарызаванай Заходняй Беларусі і ўкраінскіх тэрыторыяў.

Новы радавы пасол.

У Варшаву 2 лістапада прыехаў новы пасол СССР, Войков, якога на станцыі сустрэў прадстаўнік польскага міністэрства загран. спраў і ўвесь склад радавага пасольства. У сувязі з гэтым прыездам гавораць, што ў сярэдзіне гэтага месяца пачнуцца польска-радавыя перагаворы аб гандлёвай умове паміж Польшчай і СССР.

Як відаць, Польшча пастанавіла пайсьці па сьлядох сваей „апякункі“ Францыі, якая цераз галовы палякоў падала руку СССР...

Скандал між генараламі.

Як мы ў сваім часе пісалі, ген. Лятінік (у Перамышлю) вельмі блага адазваўся аб былых легіянерах, сказаўшы: „Тыя легіянеры, якія былі нечага варты,—пагінулі; тыя, што жывуць, нічога ня варты“.

З гэтае прычыны абразілася ўсе афіцэрства, якое служыла раней у легіёнах Пілсудскага. Цэлы рад генаралаў з Рыдзам Сьміглым на чале падаўся ў адстаўку ў знак пратэсту проці таго, што ваеннае міністэрства ня здолела абараніць іх чэсьці, ня гледзячы на дамаганьне ген. Рыдза Сьміглага. Апошні вызваў ген. Лятініка на дуэль.

Толькі пасьля гэтага міністэрства звольніла ген. Лятініка са службы, скіраваўшы яго справу ў генаральскі суд.

Цікава прыпомніць, што газэта „Nowy Głos Przemyski“, якая першая надрукавала словы генарала, была за гэта сканфіскавана. Ген. Лятінік ня прызнаваўся да гэтых слоў; аднак, спэцыяльная камісія ўстанавіла, што гэтыя словы былі ім сказаны.

Заграніцай.

Выбары прэзыдэнта у Амэрыцы.

Адбыліся выбары выбаршчыкаў ад штатаў дзеля галасаваньня на прэзыдэнта.

Вынікі выбараў, паводле газэтных вестак, забясьпечываюць прэзыдэнтуру **Куліджу**.

Новы ўрад у Англіі.

Урад Мак-Дональда падаўся ў адстаўку.

Кароль адстаўку прыняў і даручыў утварэньне новага ўраду Бальдвіну, лідэру кансэрватыўнае партыі, папярэдніку Мак-Дональда на становішчы прэм'ера.

Выбары ў самаўрады ў Англіі.

На новых выбарах у самаўрады кансэрватары атрымалі большасьць. Аднак-жа і работніцкая партыя здабыла 20 новых мейсц.

Лібэралы страцілі 24 мандаты — на карысьць абодвых працўнікаў.

Замах на гішпанскага дыктатара.

На гішпанскага дыктатара ген. Прымо-де-Рывэра зрабіў замах адзін з афіцэраў, абражаны генаралам. Адна куля папала ў плячо. Па прыказу генарала зараз-жа сабраўся ваенны суд, які тут-жа засудзіў афіцэра на расстрэл.

7-ыя ўгодкі ССРР.

Камуністычная партыя выпусьціла адозву—з прычыны блізкага сьвяткаваньня 7-ых угодкаў абвешчаньня Радавых Рэспублік. У адозве ёсьць гэткія лёзунгі: „Сусьветная буржуазія баіцца толькі сілы. Дык умацоўвайце сваю сілу, работнікі і сяляне! Будуйце, папраўляйце, любіце дзіця рэвалюцыі—чырвоную армію і чырвоны флёт".

Рахунак Антаньце — за інтэрвэнцыю ў Расеі.

У сувязі з француска-радавымі перагаворамі — у адказ на прэтэнсіі заходніх крэдытараў царскай Расеі — радавы ўрад мае з свайго боку прадставіць рахунак за страты, зробленыя Расеі ад аружнай інтэрвэнцыі Антанты. Усяго аблічана стратаў на 32 мільярды залат. рублёў.

Апрача таго, мае быць зроблены асобны рахунак за расейскі флёт, захоплены Антантай, за вывезеную ёй дзяржаўную маемасьць Расеі і г. д.

У расейскім пасольстве ў Парыжу.

Былы расейскі пасол у Парыжу (ад ураду Кэрэнскага) Маклаков — на жаданьне францускага ўраду — пакінуў гмах расейскага пасольства, забраўшы з сабой архіў і больш цэныя рэчы. Гмах зойме радавы пасол.

Патрыарх Ціхан паздаравеў.

Паводле вестак з Масквы, здароўе патрыарха Ціхана гэтак направілася, што ён пачаў езьдзіць па царквох у Маскве і на правінцыі, адпраўляючы службу.

Водгукі сусьветнае вайны.

У Лётарынгіі французы арыштавалі нямецкага генарала, якога перад тым францускі суд засудзіў завочна на 5 гадоў турмы, вінавацючы яго ў прысваеньні чужых рэчаў у часе акупацыі часьці Францыі.

„Малая Антанта" кабет.

Гэтак названы кангрэс (зьезд) кабет краёў Малай Антанты, Польшчы і Грэцыі, які сабраўся ў Белградзе. Зьезд прыняў рэзалюцыю, скіраваную да Лігі Народаў, урадаў і парлямантаў усіх дзяржаў, якія належаць да Лігі, дамагаючыся, каб кабеты ўсюды мелі аднолькавыя з мужчынамі правы.

Фабрыка фальшывых пашпартоў у Букарэшце.

У Букарэшце паліцыя выкрыла фабрыку фальшывых пашпартоў, якая працавала ў шырокім маштабе. Арыштаваны... сэкрэтар міністра ўнутр. спраў.

Ліквідацыя барацьбы ў Кітаю.

З Тсян-Тсіну паказуюць, што весткі аб узнаўленьні барацьбы генаралам Пэй-Фу — нязгодны з праўдай. Пэй Фу і Фэны-Ю-Ксяны зрабілі замірэньне, спынілі змаганьне і пачалі перагаворы аб аканчальнай ліквідацыі хатняе вайны.

Пішыце ў газэту аб усім, што ў вас дзеецца: аб гмінных парадках, аб адносінах начальства, аб школах і навуцы, дый аб усякіх выпадках ў жыцьці вашае ваколіцы. Пішыце коратка, але поўна і ясна, паказываючы акуратна: што, дзе, калі і кім зроблена прозьвішчы і адрасы пакрыўджаных і крыўдзіцеляў. Канешне падпісывайце і свае імя—толькі для ведама Рэдакцыі!

Аб чым пішуць.

Яшчэ аб „грамадзянскай" шулерні.

З лёгкае рукі часопісі „Jutro", якая першая адважалася паказаць, чым запраўды зьяўляецца так-званая „беларуская" полёнофільская партыя ў Заходняй Беларусі і каму пан прэм'ер Грабскі так неасьцярожна цісну ў „шляхотныя" рукі, — польская прэса выкрывае новыя падробнасьці з жыцьця „Грамадзянскага Сабраньня" ў Вільні і адносінаў да яго тутэйшае паліцыі.

Вось, што піша нейкі „St. T." ў газэце „Echo Warszawskie":

У Вільні ад раду месяцаў публічная апінія, далікатна кажучы, парушана тым, што такі Беларускі Грамадзянскі Клюб істнуе і кожын дзень зьбірае сотні людзей.

Аднак, няхай ніхто не падумае, што тамака зыходзяцца людзі — ў першы чарод беларусы—дзеля нейкага культурнага дзела, таварыскага ці спартовага. О, не! Бо-ж трудна залічыць да гэткага дзела масавую ігру ў лото, газардовую ігру ў карты і т. п. Гэтак у гэтым клюбе праігрываюцца дзесяткамі чыноўнікі, афіцэры, купцы і прамыслоўцы, студэнты і вучні, ну, і г. д.

Гаспадаром клюбу зьяўляецца нейкі п. Валэйша. Хто такі гэны пан — ня ведаю. Аўтар артыкулу ў часопісі „Jutro" кажа, што гэта „тып, каторы служыў спачатку беларусам, пасьля бальшавікам, літвінам, а цяпер палякам... Валэйша быў у свой час (1922 г.) арыштаваны за працідзяржаўную дзейнасьць, а пасьля выпушчаны дэфэнзываю за некаторыя зробленыя ім услугі".

Тут істнуе пагляд, што беларускі клюб патрэбен гэнаму пану **дзеля яго полёнофільскай працы** сярод сягоньняшніх яго беларускіх землякоў.

Аднак, паскольку мае ведамасьці—точныя, гэны пан лішне скампрамітаваны ў беларускіх ідэйных сфэрах, каб яму давяралі, — а тыя, з кім ён мае бліжэйшыя зносіны, належаць да таго-ж, як сам, гатунку, дык **не прадстаўляць таго паважнага і цэннага элемэнту, на здабыцьці якога магло-б каму-хоч залежаць.**

А тым часам „Беларускае Грамадзянскае Сабраньне"— **гэта правакацыя чэснае віленскае апініі.** Істнаваньне яго падрывае славу некаторых, з іншага боку, шанаваных прадстаўнікоў тутэйшае арганізацыі **публічнае бясьпечнасьці.**

На фоне адносінаў гэтых паноў да клюбу ходзяць розныя чуткі і плёткі, падаючца нават рапарты вышэйшай уладзе, вынікам чаго быў **спэцыяльны прыезд у Вільню на сьледзтва падкамісара галоўнае каманды дзяржаўнае паліцыі**.

Хаця не ўстаноўлена нічыя канкрэтная віна, але такія адносіны вытвараюць бражэньне і развал. Вынікам сьледзтва гэнага падкамісара зьяўляецца **перанос аднаго падкамісара паліцыі** з становішча, на якім ён мог беспасярэдне стыкацца з клюбам, на іншае становішча—болей-меней нэўтральнае.

Аўтар стацьці ўсім гэтым глыбока абураны і кліча ўладу да спыненьня ўсяго гэнага бруду:

Разумею, што могуць тут мець вагу прычыны палітычнага характару: афіцыяльна зачыніць Беларускі Грамадзянскі Клюб—гэта выклікала-бы крыкі ў рознага роду Тарашкевічаў, Луцкевічаў, Станкевічаў і т. п. беларускіх дзеячоў, зрабіла-бы ўражаньне, што польскі ўрад уціскае нацыянальныя меншасьці! Так, але ня ў гэтым прыпадку. **Бо паны Валэйшы, Паўлюкевічы, Салаўі — гэта ня ідэйныя дзеячы,** а, наадварот, даволі скампрамітаваны ў вачох павадыроў беларускага руху; з другога боку, можна і не карыстацца такімі радыкальнымі спосабамі. Забараніце ў беларускім клюбе газардовую ігру ў лото і ў карты, а я ручаюся, што адным махам ачысьціце гэты сягоньняшні „прытон".

Падводзячы ітог, можна сьмела сказаць: **адабраньне права газардовае ігры ў беларускім клюбе ў Вільні ачысьціць атмасфэру, крэпка згушчоную парамі бруду і згнілізны.**

Зусім справядліва: бо-ж тады, як ня будзе грошы да падзелу, уся гэная — кажучы славамі „Jutra"—кумпанія „z-pod ciemnej gwiazdy", якая складае „полёнофільскую партыю", разьляціцца ў-ва ўсе бакі, шукаючы іншага, ня менш „чэснага" заробку....

Ня верыцца толькі, каб адміністрацыйная ўлада гэта зрабіла — ведама, з увагі на „спэцыяльныя" ўслугі „грамадзянскае" шулерні, але зусім ня дзеля страху перад крыкам Тарашкевічаў, Луцкевічаў, Станкевічаў і іншых беларускіх дзеячоў: вось-жа не баяліся паны інспэктары пазачыняць апошнія беларускія школы ў Вялейшчыне, не баіцца ўлада і канфіскаваць ды зачыняць беларускія ідэйныя часопісі!

ХРОНІКА.

У справе пасла Барана. Як ведама, беларускі пасол, Сяргей Баран, знаходзіцца ў польскім вастрозе, засуджаны ў справе „45" (на беларускім працэсе).

Арышт гэтага выдатнага беларускага дзеяча знайшоў адгаласак і ў Менску, дзе беларускае грамадзянства распачала крокі перад радавым урадам, каб, пры найбліжэйшым абмене палітычных вязьняў з Польшчай, ССРР зажадаў-бы выдачы Барана. У Вільню нават былі прыйшлі весткі з Менску, што імя Барана, будзе стаяць чуць што не на першым месцы сьпісу асоб, падлягаючых звальненьню ў ССРР з польскіх вастрогаў.

Цяпер нас інфармуюць, што, ня гледзячы на ўсе абяцанкі Масквы, у прысланым у Варшаву сьпісе імя Барана ня толькі не стаіць на адным з першых месц, але і зусім ня зьмешчана.

Як відаць, усе ранейшыя завярэньні аказаліся „кепскім жартам"!

З літэратурнае нівы. Жыдоўская газэта „Тог" у № 251 з 6 кастрычніка надрукавала пераклад выдомага мастацкага апавяданьня нашага выдатнага пісьменьніка Зьмітрака Бядулі пад загалоўкам „Маліт-ва малога Габрусіка".

Пераклад зрабіў жыдоўскі літэратар Б. Кон, які абяцуе пасьвяціць нашаму пісьменьніку спэцыяльны крытычны артыкул.

Як ведама, Зьмітрок Бядуля—жыдоўскага пахо-джаньня, і гэта асабліва цікава для жыдоўскага грамадзянства.

Да замаху пад Турмонтам. Паводле вестак польскіх газэт, сьледзтва ў справе замаху на цягнік пад Турмонтам не зьяўляецца актам замежнае дывэрсыйнае работы, а зроблены тутэйшымі людзьмі. „Вінавайцы" (?) арыштаваны (арыштоўваюць у нас некага заўсёды!) і аддадзены сьледчаму судзьдзі ў Браславе.

Ізноў замест паліцыі—войска. 3 і 4 лістапада на ўсходняй граніцы ў Вялейскім і Дунілавіцкім паветах месца паліцыі заняло войска. Начальнік брыгады, палк. Рымша, выехаў у Вялейку, дзе будзе стала жыць і ўрадаваць.

У Вільню прыбываюць атрады ўзятае з граніцы паліцыі, якія згэтуль рассылаюцца на новыя месцы службы, ці звальняюцца.

„Крэсавыя героі". „Słowo" наказуе, што начальнік экспозытуры сьледчага аддзелу паліцыі на м. Вільню адсунуў ад выпаўненьня абавязкаў двух сваіх **заступнікаў** (ого!): падкамісара Заборовскага і асьпіранта Кеджыньскага. Аб іх вядзецца сьледзтва ў справе праступленьняў, учыненых у часе ад 1920 да 1923 года.

Як відаць, у працягу трох гадоў трымалі ў сваіх руках лёс тысячаў людзей—крымінальныя праступнікі. Тыповы „крэсавы" абразок!

Абодва „крэсавыя героі" арыштаваны і пасаджаны ў Лукішскі вастрог, дзе, як ведама, адбываюць кару іх „калегі" з вялейскае паліцыі—сябры бандыцкае арганізацыі асьпіранта Катарбінскага.

У друкароў. Узнавіў сваю дзейнасьць кляса-вы саюз работнікаў друкароў. Выбраны новы ўрад з 7 асоб.

У літвіноў. 2 лістапада адбыўся агульны сход сяброў Літоўскага Камітэту помачы пацярпеўшым ад вайны. На сходзе былі адзначаныя чысленыя перашкоды з боку ўлады ў працы Камітэту.

Сярод мусульман. У нядзелю, 2 лістапада, у імама пры мячэці адбыўся сход віленскіх мусульман, на якім, паміж іншым, пастаноўлена склікаць у Вільні мусульманскі зьезд з усяе Польшчы.

Як падае „Kur. Wil.", у Вільні жыве каля 200 мусульманскіх сямей.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грам. Рэдактар!

З прычыны далейшае зьвягі і паўтараньня рознае брахні на мяне на страніцах валэйшаўскіх органаў „Абуха" і „Грамадзянскага Голасу", каб раз палажыць канец ілжывым гутаркам аб маіх разрахунках з „Грамадз. Сабраньнем", прашу не адмовіць зьмясьціць у „Сял. Праўдзе" дакумэнты аб уступцы мной „Сабраньню" часьці маей былой кватэры і здачы яму-ж у арэнду бібліатэкі:

I. Радзе Старшын Беларускага Грамадзянскага Сабраньня. У адказ на Вашу прапазіцыю, пераказаную мне Панам Прэзэсам Рады Старшын, гэтым паведамляю, што згаджаюся аддаць да ужытку Сабраньня, як сублякатара, часьціну кватэры маей пры Віленскай вуліцы дом № 33, пам. № 1, апрача двух пакояу, якія я пакідаю за сабою. За карыстаньне з сказанага памяшчэньня, разам з маімі мэблямі, якія тамака знаходзяцца і опісь якіх павінна быць неадкладна зроблена, Беларускае Грамадзянскае Сабраньне павінна узяць на сябе аплату уласьніку дому усяе сумы, якая будзе выпадаць за арэнду усяе мае кватэры.

Калі-б Беларускае Грамадзянскае Сабраньне захацела зрабіць арэндную умову на маю кватэру беспасярэдна з уласьнікам дому на свае уласнае імя, я згаджаюся даць на гэта сваю згоду, з тэй умовай, што буду мець права у кожын мамэнт забраць адтуль усе свае мэблі і бібліатэку, аддадзеную Сабраньню дзеля часовага карыстаньня сябрамі Сабраньня. Вільня, 24 мая 1923 году. (—) *А. Луцкевіч.*

II. Радзе Старшын Беларускага Грамадзянскага Сабраньня. У адказ на прапазіцыю, зробленую мне на словах п. Прэзэсам Рады Старшын, гэтым паведамляю, што згаджаюся аддаць у арэнду Беларускаму Грамадзянскаму Сабраньню маю бібліатэку, якая знаходзіцца у памяшчэньні маім пры Віленскай вуліцы, дом № 33 пам. № 1, лічучы ад сягоньняшняга дня на паўгода, на ніжэйпісаных варунках:

1. Карыстацца кнігамі могуць, выключна, сябры Сабраньня, якое прыймае на сябе абавязак компэнсацыі мяне за усе прапаўшыя кнігі па рынковай іх цане.

2. Кіраўніком бібліатэкі можа быць толькі тая асоба, на каторую будзе мною дадзена згода.

3. За першае паўгода Сабраньне выплачывае мне восем мільенаў польскіх марак, у якую-то суму залічаюцца унесеныя мне сягоньня, як задатак, чатыры мільены польскіх марак, а

другія чатыры мільны павінны быць заплочаны мне не пазьней, як 15 чэрвеня 1923 года.

4. Аб варунках арэнды Сабраньнем маей бібліатэкі на далейшы час па скančэньні паугода мае быць зроблена новая умова не пазьней, як за два тыдні да канца арэнднага часу. Вільня, 5 чэрвеня 1923 г. (—) *А.. Луцкевіч.*

На першым дакумэнце зроблены гэткі надпіс 20 ліпня 1923 году:

Ад вышэй пісанага Грамадзянскае Сабраньня, з прычыны немагчымасьці звольніць памешканьне ад рэквізіцыі, адмауляецца аднячасна з ліквідацыяй умовы аб арэндзе бібліатэкі Грамадзяніна Луцкевіча з Сабраньнем. 20./VII. 1923 г. *Сэкрэтар і Гаспадар, Старшыня П. Жаурыд.*

З гэтага ясна відаць, што аб факце рэквізіцыі маей кватэры Сабраньне **ведала**; больш таго: „сам“ Валэйша ўзяў на сябе ўсе клапоты ў справе зьняцьця рэквізіцыі, кажучы, што Дэлегат Ураду п. Роман яму ў гэтым не адмовіць...

А вось квіты аб звароце мной Сабраньню грошы:

1. З прычыны немагчымасьці карыстацца Бібліатэкай, Беларускім Грамадзянскім Сабраньнем атрымана ад п. А. Луцкевіча у лік звароту заплачанае арэнды два мільены марак. 13./VII. 1923 г.—*Прадседацель Валэйша, Сэкрэтар П. Жаурыд.*

2. У лік звароту грошай, атрыманых гр. Луцкевічам ад Беларускага Грамадзянскага Сабраньня, як плату за арэнду бібліатэкі яго пры Віленскай вул. № 33, пам. № 1. атрымана Грамадзянскім Сабраньнем адзін мільен польск. марак (1.000.000). *Гаспадар Сабраньня П. Жаурыд.*

3. У лік звароту арэнды за бібліатэку на Віленскай вул. № 33, пам. 1, атрымана ад п. А. Луцкевіча два мільены пол. марак—31./VII 1923 г.—*Старшыня Беларускага Грамадзянскага Сабраньня Валэйша.*

На іншую брахню, якую Валэйша пазваляе сабе ўкладаць у вусны грам. Жаўрыда, каторы цяпер **жыве ў Менску і запярэчыць ня можа**, лічу лішнім адказываць.

З пашанай *Ант. Луцкевіч.*

Вільня,
1./XI. 1924 г.

Карэспандэнцыі.

Барацьба за беларускую школу.

(*З Лідзкага пав.*).

Грамадзяне вёсак: Альхоўкі, Пудзіна і Васілевічы, Дакудаўскае гміны, зрабілі прыгаворы аб адчыненьні беларускіх школ. Саставілі, падпісалі; асталося толькі зацьвярдзіць. Але камандант Дакудаўскае паліцыі, пан Жэрко, загадаў паліцыянту Аляксандравіку **адабраць прыгаворы**, а той і „рад старацца“.

І вось, прыйшоўшы з нейкімі 2 асобамі (ма‘ быць шпігамі, бо былі апрануты ў цывільныя вопраткі) ў в. Альхоўку, прыказалі солтысу Анацьку аддаць прыгавар, што солтыс і зрабіў.

Прытым **пагражалі за адчыненьне беларускае школы трохмесячным арыштам.**

Гэтак-жа сама адабралі прыгаворы ад солтыса Стэфановіча ў в. Васілевічах і ад Пудзінскага солтыса Мацеля, ды ім таксама пагражалі вастрогам.

16 кастрычніка вучыцелька польскае школы ў м-ку Дакудаве сабрала сход. Сход гэты быў у памешканьні школы, на якім вучыцелька, пані Білусоўна жалілася грамадзянам, што не хапае ў школе лавак і другіх школьных прыладаў, ды што? Дакудаўская гміна, павятовы соймік і школьны інспэктар Лідзкага пав. катэгарычна адмаўляюцца даць дапамогу для нашай школы. Прыгэтым вучыцелька прасіла грамадзян пайсьці насустрэч польскай школе. Грамадзяне згадзіліся, але з свайго боку **зажадалі беларускай школы**, п. Білусоўна адказала: „я заяўляла Лідзкаму школьнаму інспэктару аб тым, што ў нас вядзецца агітацыя за беларускую школу, але пан інспэктар адказаў, што ў Дакудаве адчыніць беларускай школы ня можа, бо ў яго няма яшчэ закону“. Хоць і пастанавілі на гэтым сабраньні адчыніць у Дакудаве беларускую школу, але прыгавору ня пісалі, бо пішы ня пішы, а ўсё роўна паліцыя адбярэ.

Я пытаюся: ці можна адчыняць беларускія школы?

Антось Бедны.

Ад Рэдакцыі: дамагацца беларускіх школ можна і трэба. На гэта мы маем права, паводле, так-званага „языковага“ ўставу, які прайшоў праз Сойм і Сэнат і абвешчаны Прэзыдэнтам дзеля выпаўненьня.

На жаль закон гэты астаецца дагэтуль толькі „на языку“. Дык тым балей трэба нам дабівацца свайго, што нам па праву належыцца!

З падвіленскае вёскі.

У вёсцы Каменны Лог, Шумскай гміны, Віленскага павету, а гадзіне 8 зрана, 30 кастрычніка згарэла лазьня грамадзяніна Яна Гушчы. Не бяда, каб адна лазьня, але пры гэтым абгарэлі 7 працаўніц, якія ў гэны час працавалі над лёнам.

У гэнай вёсцы бабы сушаць лён у лазьні: там яго і мнуць талакой. Працаваць сабралося дванаццаць работніц. Агонь даў такі выбух, што не змаглі ўцячы. Пагарэла адзежа працаўніц.

Найбольш пацярпелі Ядвіга Пракаповіч і Лісоўская. Пацярпеўшых адвязьлі да эпідэмічнага шпіталю ў Шумску, дзе ім была аказана помач.

Прычына пажару — неасьцярожнасьць.

Трылісьцьнік.

Пужаная варона куста баіцца.

(*Паставы, Дунілавіцкага павету*).

Вельмі запуджаны нашы паны бандытамі, дык і катоў баяцца.

З 13 на 14 кастрычніка на нашага вэтэрынарнага доктара напалі „бандыты“, але толькі на сталяваньне, а ня ўхату, дык і бараніцца было добра. Адчыніўшы вакно, доктар пачаў крычаць і страляць.

Праяжджаючы ў гэты час пачтар Чарэнка, пачуўшы крык, пасьпяшыў на помач.

Пан Царградзкі загадаў яму лезьці на сталяваньне, але пачтару жыцьцё не надаела, і ён пабег у паліцыю. Прышла паліцыя, акружыла хату, а ў хаце?.. ціха спакойна. „Разбудзілі“ пана Царградзкага і пытаюцца, што і як? А той кажа: „купіў новы рэвальвэр і прабаваў, ці добра страляе“. А бедны пачтар чуць па карку не дастаў за помач.

А калі на заўтра разабраліся, дык выясьнілася, што каты забраліся на сталяваньне, а чаго?... хто іх ведае. Мо‘ мяса захацелі пакаштаваць, а мо‘ палячыцца захацелі, але, ня хочучы турбаваць паначы пана доктара, думалі пераспаць на столі... **Сівая сярмяга.**

Барацьба сялян з маральным брудам.

(*Пружаны, гміна Шэні*).

Вясною 1923 г. войт Шэнеўскай гміны, Антон Шышка, за грамадзянскія грошы, сабраныя з людзей, як гмінны падатак, купіў сабе 5 маргоў сенажаці. Рэвізыйная камісія гміннае рады ўлавіла на гэтым „панскага“ войта і пакіравала справу да пружанскага старасты. Стараста зьмясьціў яго з пасады войта і абяцаў, як найхутчэй, папоўніць касу, але аднячасна зацьвярдзіў яго-ж паслом да павятовага сойміку!

Аднак-жа справа была аддана да горадзенскага пракурора, і 11/III гэтага году „панскі“ войт Шышка быў засуджаны на 3 месяцы турмы, і толькі па амнэстыі кара ня была выпаўнена.

Мусіць дужа вялікая дружба злучае гэтага выкідыша вёскі з панамі-абшарнікамі, калі сам пружанскі п. Стараста зажадаў бачыць яго зноў войтам, не зьвярнуўшы ўвагі на тое, што горадзенскі пракурор прыслаў да гміны гэтакага зьместу бумагу:

PROKURATOR
przy
Sądzie Okręgowym
w Grodnie
dnia 24 maja 1924 r.
№ w 127/24 r.

Do ksiąg ludności.

Niniejszem komunikue, iż mieszk. wsi i gminy Szenie, powiatu Prużańskiego, Antoni Szyszko, syn Stefana, lat 42, wyrokiem Sądu Okręgowego w Grodnie z dnia 11 marca 1924 roku na mocy art. 578 cz. I i III i 53 K. K. skazany został na trzy miesiące więzienia, lecz na mocy amnestji kara ta została mu darowana w całości.

І панскі прысьпешнік Шышка, хаця-ж і ў „zawieszeniu“, зноў войтам езьдзіць па вёсках і зьбірае падаткі. Гмінная рада 21 верасьня на сабраньні сваім пастанавіла, на падставе пракурорскага пісьма, трэбаваць выдаленьня нячэснага войта, калі-ж гэта ня будзе споўнена, дык лічыць усю раду распушчанай. Праўда, каму хочацца браць на сябе адказнасьць за крыміналіста?

Увесь народ у гміне кажа, што гмінных падаткаў больш таму войту ня будзе плаціць, бо ён украдзе сабе на маёнтак,—той панскі войт, каторы за часаў нямецкай акупацыі быў старастай над цэлым раёнам і прыдбаў сабе дужа благую славу, бо лавіў ваеннапалонных і перадаваў нямецкай вайсковай уладзе, прымушаў сялян, асабліва дзяўчат, служыць яму паншчыну пад страхам высылкі ў Нямеччыну на работу. Яму нясьлі падаркі, каб ня выдаў немцам, хто меў сьвіньню, або курыцу. Падабалася яму жывёла ў мужыка: едзе купляць і дае цану, якую сам хоча, а калі гаспадар спрачаецца, то пагражаў заявіць нямецкаму каманданту, каторы дарма забярэ! Рукі і ногі цалавалі яму сяляне пры нямецкай уладзе, каб толькі адратаваць свае дастаткі і жыцьцё.

Цікава прасачыць псыхалёгію цёмнае сялянскае масы і яснавяльможную панскую. Тады, як мужыкі з болем у сэрцы адчуваюць на сваіх грамадзкіх справах зьдзекі і няпраўду, п. Стараста ня цураецца гэтакае непашаны свайго „заходнякультурнага“ панскага гонару, падбіраючы ўрадоўцаў спасярод угалоўных адпадкаў сельскае грамады.

Многа дужа ганаровых паноў мае Пружанскі павет, а ні адзін, нават і той, што ў Шэнеўскай Гміннай Радзе, не абурыўся на зладзейства, з якім распачала барацьбу такая раней паслушная гмінная рада. А ўсе-ж яны засядаюць у Пружанскім сойміку і добра ведаюць, што той Шышка, асуджаны ў турму, ня толькі шэнеўскі войт, але іх „калега“ — сябра павятовага сойміку.

Эх, паночкі!.. кіньце йграць у „заходнюю культуру!“ Надта-ж ужо дзяшовы ваш гонар і выхаваньне! **Селянін.**

Ад Рэдакцыі: Мы шчыра вітаем гэту барацьбу нашых сялян з маральным брудам, бачучы ў гэтым знак, што няволя ня здолела забіць ў нашым народзе маральнае пачуцьцё, так рэдка спатыканае цяпер сярод „культурных“ станаў!

Вось, як у нас „добра“ жывоцца!

(*Радашкоўская гміна, Вялейскага пав.*).

Няма абароны ад гэтай паншчыны. Досьць ужо гэтыя падаткі не даюць жыць! Не заплаціў адных, як табе пяруном солтыс нясе другую паперку на другія. Страх бярэ ад гэных падаткаў. Ня ведаеш, за што плаціш, сколькі ў год і каму? А зарабіць няма дзе. Хоць з скуры вылазь, а паншчыну адбывай акуратна і заўсёды „natychmiast“. На панскія бязмежныя абшары йдзі, праў дарогі; то капай равы, то карчуй пні ад сосен, якія пан даўна ўжо соладка пражыў дзесь у Варшаве, а то і заграніцай. А ты, „białoruski chamie“,— мусіш на яго бруха працаваць, не адгінаючы сьпіны.

Вось, прыклад, 17 гэтага кастрычніка пан войт Радашкоўскае гм. выгнаў паліцыяй усю гміну „**правіць**“ абшарніцы Янушэўскай лясную дарогу. Паслухайце, добрыя людзі. Сьмех бярэ і злосьць. У пярод нас ганялі капаць равы і высака насыпаць дарогу, тады вазілі коньмі жвір, а цяпер ізноў выгналі разрабляць, значыцца, згортаваць тую насыпаную зямлю з дарогі ізноў у равы. А гэта толькі дзеля таго, як кажуць: будзе на днях ехаць пан ваявода, а пясок насыпаны на дарогу яшчэ ня ўлёгся, ня ўбіўся (ведама, сухая восень), дык ваяводзкаму „яго міласьці“ аўтамабілю будзе цяжка, а дзеля гэтага „беларускае хам‘ё“ нашай гміны без работы сядзець не павінна. Трэба з пустога ў парожняе перасыпаць. Капай, насыпай, вазі і ізноў згортавай у равы пясок, а як праедзе пан ваявода, ізноў пагоняць насыпаць. Адным словам, адбываем „муштры“ на панскай зямлі і на панскую карысьць.

Мала гэтых дарожных муштраў, а яшчэ-ж і ад дзесяціны трэба плаціць нейкія дарожныя падаткі. Ды і цяпер па вёсках ходзяць нейкія замершчыкі і мераць будынак. Мерыць і ня пытаецца, чыё мерае. Яшчэ з нейкім гонарам. Усё роўна, як сваё, ці, не мяркуючы, ён, гэты замершчык, панарабляў нашаму селяніну гэтых хлеўчыкаў і прыхлеўчыкаў, а мера-ж так шчыльна, што і вада не пацячэ. Вядома, і гэтае мераньне для падаткаў, бо на якое-ж ліха ён бы мерыў? Цяпер і скрабі патыліцу і думай: дзе-ж гэта зарабіць грошай на гэтыя дані, ці-ж вясьці на торг апошнюю кароўку? але-ж тады дзеткі паўміраюць з голаду. А павядзі ў нас—у Радашковічы карову, ці павязі якое парасё на торг, дык цябе ў вуліцы пярэйме нейкі „вышыбайла“ магістрацкі з цэтлікамі і зьдзярэ 4 злоты. Прадаў, ці не прадаў, а няма грошаў—хоць ты кончыся, падавай! Вось, як у нас добра жывецца. **Варановіч.**

Беларусы у Чэхіі.

Беларускі спэктакль у Юзэфове.

Пастаноўкай „Птушкі Шчасьця“ — Ф. Аляхновіча 18 кастрычніка г. г. ў Юзэфове (табор украінцаў) — распачаў сваю дзейльнасьць „Драматычны гурток пры Беларускай Радзе ў Празе“.

Перад спэктаклям старшыня гуртка Л. Заяц і адміністратар К. Шышкоўскі зьдзелалі візыты галаве м. Юзэфоў п. Мільлеру, старшыні чэск. прасьветнага т-ва п. Крапыку, вялікаму прыхільніку славянскіх народаў, начальніку гарнізона, а таксама чэскай управе табараў з п. Хроўстам на чале і ўкраінскай табаровай камандзе, са згоды якіх у табаровым тэатры і быў пастаўлены беларускі спэктакль. Усюды прадстаўнікоў драматычнага гуртка спаткаў вельмі прыхільны прыём і было выказана пажаданьне, каб гурток прыяжджаў з беларускімі пастаноўкамі часьцей.

Спэктакль можна лічыць наагул удаўшымся, бо артысты былі добра падгатаваны і йгралі з адпаведным уздоймом. Асабліва на публіку зрабіў вялікае ўражаньне 2 акт пьесы. Былі, канешна, і недачоты. Галоўны з іх — гэта ня сьпетасьць з аркестрам (што часамі яўна адчувалася!), з якім удалося, нажаль, зрабіць толькі адну рэпэтыцыю да спэктаклю, — бо Юзэфоў ляжыць ад Прагі ў 5 гадзінах язды.

Жыду (В. Цыбуля) не саўсім удаліся сьпевы, бо ён быў моцна прастуджаны. Украінскі табаровы аркестр вельмі добра разыграў усе матывы пьесы, якія мастацка аркестраваў п. Баран. Дзеля таго, што Юзэфоў далёка ад Прагі, то з дапамогай гуртку, чым толькі магло, прыйшло табаровае драматычнае т-ва імені Н. Франко з палк. Аркас і сэкрэтар. Яцушко на чале.

Чарговы беларускі спэктакль адбудзецца ў Празе 10 лістапада г. г. **Л. Ш — ло.**

Прага, 30 кастр. 1924 г.

Рэдактар-Выдавец **Антон Войцік.**

Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.